Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 23 Вільня, Пятніца 10 ліпня 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Жадаем праўды і справядлівасьці.

У гэтым нумары нашай газэты чытачы знойдуць вестку аб тым, што працэс над менскімі беларускімі культурнымі дзеячамі, якіх камуністы пасадзілі ў турму, адложаны на неазначаны час і што тымсамым камуністычныя ўлады будуць „дабівацца" ад вязьняў прызнаньня і пакаяньня ў сваіх „праступках".

Хто ведае спосабы, якіх сяньня ўжываюць камуністы дзеля „ўціхаміраньня беларусаў і іншых „інародцаў", таго гэтая вестка ня зьдзівіць, бо цяпер, як ведама, камуністы высьцерагаюцца масавых працэсаў, каб не рабіць лішняга шуму і розгаласу па сьвеце аб стасаваных імі прасьледах. Яны толькі тады робяць судовыя працэсы, калі здабыта поўнае „прызнаньне" ад абвінавачаных у іх віне і калі гэтыя абвінавачаныя гатовы пакаяцца прад усім сьветам за свае „праступкі". Прыкладам такой практыкі камуністычнай ўлады быў працэс украінскай групы на чале з Ефрэмавым і працэс Рамзіна, дзе пагалоўна ўсе абвінавачаныя голасна і публічна прад судом і нават праз радіо прад усім сьветам каяліся ў сваіх „праступках". Гэтакі працэс — з каяньнем — мае для камуністаў нейкі сэнс, але такі працэс, на каторым абвінавачаныя прад усім сьветам маглі-б абвінаваціць камуністаў у стасаваным імі прасьледу, не дае ім ніякае карысьці; затым яны яго і адкладываюць. А тымчасам няхай вязьні сядзяць: калі пакаюцца — будзе працэс, а калі не пакаюцца— то іх і без працэсу можна пусьціць у „расход"...

На гэтым грунце савецкага жыцьця малюецца ўвесь трагізм тамашніх беларусаў і становіцца зразумелай сьмерць праф. Ігнатоўскага. Мы тут седзячы пад Польшчай, часта ня маем магчымасьці праверыць усіх тых вестак, якія да нас прыходзяць: мы мусім апірацца або на афіцыяльных даных савецкага ўраду, або на тых вестках, якія прыходзяць да нас з заграніцы. Паводле афіцыяльнага камунікату савецкага ўраду (гл. „Известия" з 1.XII 1930 і „Правда" з 2.XII. 30) пасаджаны ў турму Ластоўскі, Цьвікевіч, Краскоўскі, Смоліч, Лёсік, Некрашэвіч і іншыя. Якія гэта будуць „іншыя" і колькі іх, аб гэтым савецкая ўлада маўчыць. Маўчыць яна таксама аб сьмерці праф. Ігнатоўскага, як маўчыць і аб спробах самагубства Янкі Купалы. Толькі ў апошніх часах пачалі прыходзіць падазронныя запярэчаньні аб сьмерці Я. Купалы, але аб сьмерці праф. Ігнатоўскага пастарому глыбокае маўчаньне, да таго нават, што няведама якой сьмерцяй ён згінуў, самагубствам, ці быў забіты — як няведамы таксама сапраўдны стан здароўя нашага паэта Я. Купалы.

У справе менскіх арыштаў і сьмерці праф. Ігнатоўскага гаворыць так-жа „Бюлетэнь Аб'еднаньня Беларускіх Студэнскіх Арганізацыяў", які выходзіць у Празе Чэскай і хіба-ж лепш як мы паінфармаваны аб тым, што робіцца ў Менску. Гэты „Бюлетэнь" у нумары 3-ім з чэрвеня г. г. гэтак піша:

„Выдатнейшыя беларускія вучоныя: Ул. Пічэта, Усев. Ігнатоўскі, А. Смоліч, Яз. Лёсік, В. Ластоўскі, І. Краскоўскі, Г. Гарэцкі ды інш. насільна адрываюцца ад распачатае імі працы навуковага досьледу і вывучэньня Беларусі, кідаюцца за вастрожныя краты, абвінавачываюцца маскоўска-бальшавіцкай уладай у розных гнусьліва-прыдуманых недарэчнасьцях, а фактычна — толькі за тое, што мелі грамадзкую адвагу сказаць навуковую праўду аб Беларусі.

Гэткая-ж расправа адбываецца з беларускімі пісьменьнікамі і настаўнікамі.

„Але што найбольш ёсьць жудаснае — піша далей „Бюлетэнь" — гэта раптоўная сьмерць прафэсара Ўсевалада Ігнатоўскага, першага прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук: таёмная сьмерць яго за вастрожнымі кратамі. Чаму аб гэтым маўчыць бальшавіцкая прэса? Чаму ня скажа, як і пры якіх абставінах перастала біцца сэрца, што так горача любіла жыцьцё і волю, свой родны край? Як і пры якіх абставінах занямела крытычная думка, што будзіла нацыянальную і сацыяльную сьведамасьць міліонаў, наяўна выяўляючы праўду аб гістарычнай мінуўшчыне Беларусі? Што сталася за вастрожнымі кратамі з прафэсарам Усеваладам Ігнатоўскім: самагубства, ці пачварна-грубое забойства".

Заграгічныя беларускія студэнты хочуць дабіцца ад камуністаў адказу, але мусіць дарма — не на тое камуністы пусьцілі „ў расход" беларускага вучонага, каб потым расказваць аб сваім злачынстве!

Затое камуністы пусьціліся на іншы спосаб — яны на Зах. Беларусі, на каторай сумным рэхам адбіліся мерскія падзеі, раськідаюць праклямацыі, у якіх цьвердзяць што Ігнатоўскі жыве!...

Робяць гэта безадказныя людзі ў безадказных афішах, якія можа надрукаваць і раскінуць хоць хто, але чаму камуністы маўчаць у сваей афіцыяльнай прэсе? Калі пару гадоў таму была разышоўшыся вестка аб арышце Якуба Коласа, то савецкае пасольства ў Варшаве зараз-жа разаслала па ўсіх рэдакцыях запярэчаньне, а цяпер, калі ўжо не аб арышце ідзе гутарка, але **аб сьмерці** б. прэзыдэнта Беларускай Акадэміі Навук, то савецкія ўлады маўчаць. Што гэта мае значыць? Гэта знача, што прафэсар Ігнатоўскі згінуў нейкай загадковай сьмерцю, да каторай камуністам стыдна прызнацца.

Дык Беларускі народ павінен рашуча дамагацца ад камуністаў ня толькі выясьненьня сьмерці праф. Ігнатоўскага, але таксама рашуча павінен дамагацца выпушчэньня на волю беларускіх культурных работнікаў, або працэсу над імі, пакуль яны йшчэ жывыя. Бо прыйдзе час і з імі можа стацца тое, што сталася з праф. Ігнатоўскім, а тады... ня будзе каго судзіць... Беларускі народ ня можа дапусьціць, каб гэтак зьдзекаваліся над яго лепшымі сынамі!

Пратэст

Прэзыдыюму Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні проціў стрымліваньня разьвіцьця беларускага пачатковага школьніцтва і прымусовай ліквідацыі беларускага сярэдняга школьніцтва.

Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні на паседжаньні дня 6 ліпня 1931 году ўсебакова разглядзеўшы справу беларускага школьніцтва пад Польшчай сьцьвярджае:

што польскія ўлады, не зважаючы на міжнародныя забавязаньні Польскай Дзяржавы (трактаты: Вэрсальскі і Рыскі) і польскую Канстытуцыю, якія гварантуюць нацыянальным меншасьцям пад Польшчай правы поўнай свабоды культурна-асьветнага іх разьвіцьця, сыстэматычна ліквідуюць беларускае школьніцтва сярэдняе і стабілізуючы на беларускіх землях школьніцтва польскае, спыняюць разьвіцьцё беларускага школьніцтва пачатковага.

Аб гэтым сьведчаць факты апошніх часоў:

1) Ліквідацыя беларускай гімназіі ў Радашкавічах;

2) Папярэджаньне Віленскай Школьнай Кураторыі пісьмом № II 9218-31, аб адмове для беларускай гімназіі ў Клецку канцэсіі на 1931-32 школьны год, што ёсьць роўназначным яе зачыненьню.

3) Дэкрэт Прэзыдэнта Польскай Рэспублікі з дн. 29.XI.1930 г., які стабілізуючы польскае школьніцтва на нашых землях, не дазваляе ператварэньня польскай школы на школу беларускую праз сем гадоў ад дня яе адкрыцьця.

Дзеля гэтага Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні, ад імя арганізаванага беларускага грамадзянства, прад усім цывілізаваным сьветам пратэстуе:

проціў стрымліваньня разьвіцьця беларускага пачатковага школьніцтва, проціў стабілізацыяў на беларускіх землях польскага школьніцтва і

проціў прымусовай ліквідацыі беларускай гімназіі ў Клецку, якая існуе ад 1924 году і ўтрымліваецца з ахвярнасьці беларускага грамадзянства, бяз ніякай дапамогі з боку польскага ўраду.

Падаючы гэты пратэст да публічнага ведама, Прэзыдыюм Беларускага Нацыянальнага Камітэту заклікае беларускае грамадзянства да змаганьня ўсімі праўнымі спосабамі за беларускую народную асьвету.

Вільня, дня 6.VII.1931 г.

Прэзыдыюм
Беларускага Нацыянальнага Камітэту.

Захады ў справе проціў ліквідацыі беларускай гімназіі ў Клецку.

Пасьля ліквідацыі беларускай гімназіі ў Радашкавічах, стала на парадку дня ліквідацыі беларуская гімназія ў Клецку. Беларускае грамадзянства ўстрывожанае ліквідацыяй беларускага сярэдняга школьніцтва зьвярнула на гэта сваю ўвагу і моцна зацікавілася лёсам Клецкай Беларускай Гімназіі.

З увагі на вялікае зацікаўленьне гэтай справай патрыятычна настроенага беларускага грамадзянства, падаём увесь ход справы захадаў проціў ліквідацыі беларускай гімназіі ў Клецку.

Рэзалюцыя,

прынятая на агульным сходзе Бацькаўскага Камітэту Клецкай Беларускай Гімназіі ў дзень 14-га чэрвеня 1931 г.

Заслухаўшы даклады Управы Камітэту і Дырэкцыі Гімназіі аб стане гімназіі к канцу сёлетняга школьнага году і аб тым, што гімназія з канцом бягучага школьнага году празначана Куратарыюмам Віленскага Школьнага Вокругу на ліквідацыю без паданьня

якіх кольвечы матываў, простым толькі паведамленьнем Управы Камітэту лістом № II-9218-31, агульны Сход Бацькаўскага Камітэту гімназіі сьцьвярджае,

што Клецкая Беларуская Гімназія за сем гадоў свайго шматпакутнага існаваньня выявіла сваю жыцьцёвасьць і неабходнасьць для Краю,

што ўрад і польскае грамадзянства за ўсе 7 гадоў існаваньня гімназіі ня толькі ня прышлі ей з дапамогаю, але праз увесь час яе існаваньня клалі ей адны перашкоды, якія ставіліся на дарозе нармальнага разьвіцьця школы,

што папярэджаньне Віленскага Куратарыюму аб тым, што ня дасьць канцэсіі на гімназію на 1931-32 шк. год ні на чым не абаснавана і зьяўляецца вялікай крыўдай для бацькоў, якія вучаць сваіх дзяцей у гімназіі, а зачыненьне гімназіі будзе вялікай утратай ня толькі для іх, але і для ўсяго беларускага насельніцтва краю.

Дзеля гэтага сход уважаючы кожнага з сваіх сяброў, як і кожнага беларуса, за поўнапраўных грамадзян Польскай дзяржавы, якія сумленна выконваючы накладаныя на іх дзяржавай абавязкі, жадаюць карыстацца і прыслугоўваючымі ім правамі, даручае Управе Камітэту ў бліжэйшым часе выслаць да п. Куратара Віленскага Школьнага Вокругу, а ў разе патрэбы і да цантральных уладаў у Варшаве, дэлегацыю, з дамаганьнем прадоўжаньня канцэсіі на гімназію на далейшы час, а разам з тым і забясьпечаньня быту гімназіі на роўні з другімі беларускімі гімназіямі. У склад дэлегацыі сход пастанавіў паслаць двух прадстаўнікоў ад бацькоў, аднаго прадстаўніка Пэдагагічнае Рады гімназіі і апрача таго ўпаважніць Управу дапоўніць дэлегацыю прадстаўнікамі Цэнтральных Беларускіх Культ.-Прасьветных Арганізацыяў.

Управа Камітэту.

Справаздача

Дэлегацыі Бацькаўскага Камітэту Беларускае Гімназіі ў Клецку ў справе канцэсіі на Гімназію, выбранай на падставе пастановы сходу бацькоў дня 14.VI.31 у складзе: Макарэвіча Аляксандры, сп. аб. Дырэктара Гімназіі, Мінкевіча Гаўрылы, прадстаўніка Бацькаўскага Камітэту Баранавіцкага пав., Сідаровіча Аляксандры, прадстаўніка Бацькаўскага Камітэту з Нясьвіскага пав. і дра. Станкевіча Яна.

Дэлегацыя 25.VI.31 наўперад зьвярнулася да Віленскай Куратoрыі. Дзеля таго, што Куратар быў выехаўшы ў Варшаву, дэлегацыю прыняў Начальнік Малавескі. Ён заявіў, што нічагусенькі ня ведае аб прычынах, каторыя прымусілі Куратара паказаць, што канцэсія ня будзе прадоўжана. Тое самае адказаў заступаючы Начальніка Сярэдніх Школ — Візытатар Балінскі (самога Начальніка Сярэдніх Школаў у Вільні ня было).

З Вільні дэлегацыя паехала ў Варшаву да Пана Прэзыдэнта і Міністэрства Асьветы, спадзяючыся адначасна пабачыць ў Варшаве і Віленскага Школьнага Куратара. Дзеля таго, што аб дэлегацыі ня было загадзя наказана і час у Пана Прэзыдэнта 26.VI.31 быў запоўнены, дык дэлегацыю прыняў Шэф Цывільнай Канцэлярыі. Выслухаўшы даклад дэлегацыі і прыняўшы мэморыял пан Шэф абяцаў прыхільна зрэфэраваць справу Пану Прэзыдэнту.

У Міністэрстве дэлегацыю прыняў Начальнік Сярэдніх Школ. У гутарцы з ім дэлегацыя даведалася, што Міністэрству яшчэ нічога няведама аб пастанове Куратара ня даць канцэсіі Гімназіі. Ён абяцаў, што Міністэрства даведаецца аб прычынах недаваньня канцэсіі і справу разьвяжа справядліва. Пры гэтым зацеміў, што прычынаю недаваньня канцэсіі ня можа быць навуковая роўнь Гімназіі, калі сёлета ў Гімназіі візытацыі ня было. У Міністэрстве дэлегацыя таксама падала мэморыял.

Дзеля таго, што дэлегацыя ў Варшаве Куратара ўжо не застала, дык паехала назад праз Вільню, дзе і была 27.VI.31 прынята Панам Школьным Куратарам. На пытаньне дэлегацыі аб прычынах недаваньня канцэсіі на Гімназію Пан Куратар адказаў, што адзінай прычынай гэтага ёсьць нізкая навуковая і ўзгадавальная роўнь Гімназіі. Пан Куратар зацеміў, што хоць сёлета ў Гімназіі візытацыі ня было, але аб нізкой роўні ён ведае із справаздачаў візытатараў за папярэднія гады. Навуковая роўнь Гімназіі не магла палепшыцца, бо матэрыяльнае палажэньне яе аставалася благім. Ад мясцовых уладаў адміністрацыйных ён нічога благога аб Гімназіі ня чуў.

Дэлегацыя адказала, што ў апошнім школьным годзе быў лепшы склад вучыцялёў Гімназіі, дзе на дзевяць чалавекаў, пяць было з унівэрсытэцкімі дыплёмамі, чатыры іншых маюць права здаваць упрошчаны эгзамен. Навуковая роўнь Гімназіі ў апошнім школьным годзе радыкальна палепшылася. З боку узгадавальнага ёй таксама нічагусенькі нельга закінуць. Усё акалічнае насяленьне (паветы: Нясьвіскі, Баранавіцкі, Лунінецкі, Косаўскі і іншыя) Беларускае Гімназіі ў Клецку надзвычайна патрабуе. У ёй вучацца сялянскія дзеці, бацькі каторых прывозяць ім ежу ў Клецак. Дзеля гэтага немагчыма ім было б вучыцца ў беларускіх Гімназіях у Навагрудку, або ў Вільні і вялікая часьць краю беларускага асталася-б без беларускае сярэдняе школы. Зачыненьне Беларускае Гімназіі ў Клецку вельмі балюча адбілася-б як на мясцовым насяленьні, так і на цэлым беларускім грамадзянстве й народзе наагул. Беларускае грамадзянства, а за ім і ўвесь беларускі народ, зачыненьне Клецкае Гімназіі ўважалі-б як замах на ўсё беларускае жыцьцё. Дэлегацыя ўважае, што няма рацыі зачыняць Беларускае Гімназіі ў Клецку. З такім-жа самым правам, як гімназія ў Клецку, маглі-б быць зачынены Беларускія Гімназіі ў Навагрудку і ў Вільні. І напэўна па зачыненьню Клецкае Гімназіі, прышоў-бы чарод на Навагрудзкую, або Віленскую, як па зачыненьню Радашкаўскае Гімназіі, цяпер Куратар хоча зачыніць Гімназію Клецкую.

Ня гледзячы на гэтыя довады дэлегацыі, Куратар астаўся пры сваім паглядзе і радзіў гатавацца да ліквідацыі Гімназіі.

(—) **Др. Я. Станкевіч**, (—) **А. Макарэвіч**,
(—) А. **Сідаровіч**, (—) **Г. Мінкевіч**.
27 чэрвеня 1931 г.

Чаму няма суду над Менскімі Беларусамі?

Ад асобы, якая нядаўна прыехала з Сав. Беларусі, даведываемся, што савецкія ўлады дагэтуль не назначылі працэсу над арыштаванымі за „беларускі ўхіл" беларускімі дзеячамі, з якіх некаторыя ўжо сядзяць цэлы год у турме: не маглі дабіцца ад іх прызнаньня да віны і пакаяньня ў сваіх „праступках". Працэс меўся адбыцца вясною с. г. Аднак дзеля цьвёрдасьці арыштаваных адложаны на неакрэсьлены бліжэй час. А тымчасам будуць „дабівацца" пакаяньня ад арыштаваных беларускіх культурных работнікаў.

З газэт.

Польская „Унія".

У Кракаве выходзіць ужо 7 гадоў польская месячная часопісь „Unija", якая ўважае, што рэлігійная ўнія павінна ня толькі аб'еднываць праваслаўных з каталікамі, але яна павінна прадусім пашыраць польшчыну сярод украінцаў і беларусаў. Не пабачыўшы пладоў сваей сямігадовай працы, гэтая часопісь выдала „трывожную" адозву, у якой зварочвае польскую ўвагу на разрост украінізму і беларушчыны. У гэтай адозве польскія „уніяты" заклікаюць сябе распачаць працу сваей „уніі" ад самай падставы, каб рэлігійная ўнія была такой, якой яна была некалі, калі аб'еднываючы праваслаўных з каталікамі, беларусаў і ўкраінцаў перарабляла на палякоў.

Гэтая адозва выразна пацьвярджае наш пагляд на тую ўнію, якая праводзіцца на нашых землях польскімі рукамі, а аб якой мы ня раз ужо пісалі. Гэткай уніяй зацікаўлены хіба толькі адны палякі, бо беларусы і ўкраінцы ад гэткай уніі павінны толькі бараніцца.

Кс. Яз. Бародзіч прысвоіў тытул каноніка.

Ведамы і слаўны сваімі авантурамі кс. Яз. Бародзіч, які намаўляў людзей будаваць

W. A.

Adam i Anielka. 4)

VI. Wiečaruški.

U Alšanach praści kudzielu i tkać nia ŭmieli. Zatoje rabili rukawicy z woŭny, a z hetaha zarabotku kuplali kramninu na adziedžu. Zarabotak byŭ błahi; płacili žydy, jak chacieli. Za majej pamiaci bolš niepłacili, jak pa załatom za paru rukawic, a bywała pa dwanaccać, pa čtarnaccać, pa poŭsiemnaccaci hrošaŭ. Plaskajuć, plaskajuć dziaŭčaty i baby ihlicami, a prydzie ŭ subotu wiečaram, dyk wosiem abo dziesiać złotych za tydzień wyhaniać. Adščytaj, što kaštuje woŭna, časalnia, myła, dyk za rabotu astajecca saŭsim dreń. Adnak alšancy tak uwykli, što nawiet małyja dzieci ad siami hadoŭ i staryja mužčyny rabili rukawicy. Stary Michał Jakubiel u kožny wiečar asienni i zimowy, zalezšy na pieč i ŭspioršysia na łokciu, zrobić, bywała, paru rukawic. Sprytnyja dziaŭčaty mahli za dzień zrabić piać par, ale tahdy treba było staracca. Praŭda, što rabota była tandetnaja, a žydy wywozili da wojska. Doŭhimi wiečarami dziaŭčaty zychodzilisia razam na wiečaruški, kab nie palić gazy ŭ kožnaj chacie i kab było wiesialej u hramadzie. Ihlicy zwoniać, jak zwany ŭ cerkwie, a jany śpiawajuć, abo starejšaja kabieta raskazywaje skazki. Chłopcy — raskoły prychodzili „pamahać:" pabłutajuć, bywała, pražu, abo kraduć u dziaŭčat rukawicy, kab, znakam tym, „pamyć." Nasypluć u načoŭku popiełu, sažy, naljuć wady, — adnym słowam, kryku, śmiechu bywała šmat, ale raboty mała.

Rabota ŭ poli pierarwałasia, nawiet i hrečki pawyrwany; lon paraściłany na sienažaciach. Iduć daždžy. Mužčyny małociać žyta na pasieŭ zaraz pojduć siejać. Baby ŭzialisia za rukawicy. Siahodnia wiečaruški ŭ Jakubielaŭ. Sabrałasia dziaŭčat niešta z dwaccać. Amerykaniec čytaŭ niešta pry ahni pa polsku, ale jaho mała chto słuchaŭ, bo najbolš śmiajalisia, žartawali. Susied: Andrej Hanusewič, kuryŭ papiarosu i pačynaŭ małoj dačce rukawicu. Narešcie nia wytrywaŭ.

— Daj pakoj, Adam, z hetym čytańniem, Abo jany razumiejuć, ty dumaješ? Nam treba nawuki, a to ciamnata, brat, jak toj kaža: za wučonaha dziesiać niawučonych dajuć, dy i to nie biaruć.

—Jak to my nie razumiejem? A wot usio razumiejem.

— Nu, kali razumiejecie, dyk skažycie, ab kim učora ksiondz hawaryŭ nawuku?

— Kazaŭ, jak Judaša ŭkinuli ŭ mora, dy jaho ryba hłynuła, — skazała adna dziaŭčyna.

Amerykaniec i Hanusewič zaśmiajalisia.

— A chtož jaho ŭ mora ŭkinuŭ, — pytajecca Hanusewič.

Tut dziaŭčaty paspračalisia: adny kazali, što žydy ŭkinuli, druhija — što apostały, inšyja — što sam Pan Jezus.

— Wot ja wam kazaŭ, što wy ničoha nie razumiejecie. Treba nam nawuki. U mora ŭkinuli nia Judaša, a Janaša, praroka. Boh jaho pakaraŭ zatoje, što jon nie chacieŭ iści da pahanskaha horadu Niniwy, kab tych ludziej niahodnych zaklikać da pakuty. U bruchu ryby Janaš adumaŭsia, što zrabiŭ drenna, staŭ malicca, dyk ryba jaho wykinuła na bierah.

— Tata, a što jon tam jeŭ, u tej rybie? — spytałasia dačka Andreja.

Usie zaśmiajalisia.

Tymčasam u sieniach stali stukacca. Razčynilisia dźwiery, až ujaždžaje chłapiec konna na čornym miedźwiadzi. Miadźwiedź rawie, a druhi chłapiec dziarzyć jaho na łancuhu, dy łupić bizunom. U chacie zrabiŭsia hwałt, pisk. A miadźwiedź staŭ u dybki i zaroŭ strašnym hołasam; furman z jaho zwaliŭsia. Tahdy skamaroh zahadaŭ miedźwiadziu zabrachać pa sabačamu: miadźwiedź breša; zarykać pa bydlačamu: miadźwiedź i toje patrafiŭ, nawiet pa aślinamu ŭmieŭ; kašlaŭ, jak staraja baba... Ale zahadali miedźwiadziu stać rahača: miadźwiedź padymaje zadnija nohi ŭ horu, wyšej, wyšej, až schisnułasia piarredniaja łapa i miadźwiedź hocnuŭ wobziemlu, jak kałoda, tolki-ž adjechali klapy i pakazałasia ludzkaja haława. Dyk „miadźwiedź" chutka ŭciok z chaty, kab nie paznali.

касьцёлы там, дзе такія ёсьць, называў сябе для большай павагі „канонікам“. Тымчасам, як падаюць польскія газэты, Віленская Мэтрапалітальная Курыя выдала запярэчаньне проціў публічнай ілжы Бародзіча аб тым, што ён зьяўляецца канонікам Віленскай катэдральнай капітулы. Мэтрапалітальная Курыя заяўляе, што кс. Яз. Бародзіч канонікам ня ёсьць і цьверджаньні яго аб гэтым „трэба ўважаць з грурту фальшывымі“.

Нашто патрэбныя чыноўнікі на “Крэсах“?

Польскія газэты падалі вестку, што ўрад дзеля ашчаднасьцяў скарбовых грошаў мае скасаваць некалькі ваяводзтваў. Проціў гэтага падняўся пратэст нават урадовай партыі 1-кі. Адзін аддзел партыі „адзінкі“ выдаў такую рэзалюцыю ў гэтай справе:

„З увагі на інтэрас агульна-дзяржаўны і нацыянальны (разумеецца, польскі — Рэд.) усходнія ваяводзтвы трэба вылучыць з рэдукцыі дзяржаўных урадаў“...

Адна польскэя газэта выясьняе, які гэта інтэрас не пазваляе касаваць некалькі ўрадаў на „крэсах“.

„Дзяржаўная адміністрацыя на „крэсах“—чытаем там — выконвае адну асаблівую ролю... Гэта ёсьць роля піонэрская, якая ня мае параўнаньня з ролямі ў каранных ваяводзтвах дзяржавы... Ня можна рабіць ашчаднасьцяў на місіі, якую чыноўнік-паляк праводзіць на крэсах“.

А львоўская газэта (Поранна) піша яшчэ ясьней, што калі-б у „крэсавым“ горадзе ня было ўрадаўцаў, дык пакасаваліся-б і польскія арганізацыі, бо асталіся-б толькі: судзьдзя, дохтар, аптакар і ксёндз.

Дык польскія чыноўнікі на „крэсах“ — гэта ня простыя ўрадоўцы, а піонэры і місіянэры польскасьці, гэта ўся апора польскай культуры і фундамант польскай прыналежнасьці на рубяжох сучаснай Польскай дзяржавы.

З беларускага жыцьця.

Беларускі Нацыянальны К-т аб сучасным палажэньні беларускага школьніцтва. Дня 6 г. м. адбылося паседжаньне Прэзыдыюму Бел. Нац. К-ту ў Вільні, на якім разгледжана справа ліквідацыі Клецкай Беларускай гімназіі і палажэньне беларускага школьніцтва ў Зах. Беларусі наагул. У гэтай справе Прэзыдыюм К-ту выдаў пратэст, які зьмяшчаем у гэтым нумары нашай газэты.

Забараняюць ладзіць беларускія прадстаўленьні. У апошнія часы Ашмянскае старасва не выдае дазволаў гурткам Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры на беларускія прадстаўленьні ў Ашмянскім павеце. Двойчы адмовіла дазвол, без ніякіх матываў, гуртку Інстытуту ў Мур. Ашманцы, а так-жа і гуртку Інстытуту ў Шутавічах.

Ахвяра дронічаўскага „пастырства“— Ст. Грыб на свабодзе. Дронічаўскае „душпастырства“ ў Жодзішках слаўным сталася змаганьнем з беларускасьцяй і авантурамі ў касьцеле. У выніку пачаліся арышты і суды. У канцы суд засудзіў Ст. Грыба і М. Ярмака на кару ў турму. Ярмак кончыў сваю кару месяц таму, а Грыб звольнены з вастрогу 6 г. м.

Камітэт Слуцкіх Паўстанцаў. У мінулым тыдні ў Вільні выйшла праклямацыя пад загалоўкам „Грамадзяне Беларусы“, выданая ад імя ініцыятыўнае групы, якая ўтварыла камітэт з учасьнікаў Слуцкага Паўстаньня і прыхільнікаў яго ідэі. У гэтай праклямацыі запавядаецца наладжаньне ўрачыстага абходу ў м-цы лістападзе с. г. вялікай гістарычнай падзеі вызвольнай барацьбы Беларускага народу — Слуцкага Паўстаньня.

„Сьветач Беларусі“ № 1 (4) ліпень 1931 орган „Беларускага Праваслаўнага К-ту“, старшынёй якога ёсьць Тодар Вярнікоўскі. Рэдактар гэтай часопісі У. Більдзюкевіч. Зьмест журналу на 16 бачынах друку выключна аб справях праваслаўнай царквы на беларускіх і ўкраінскіх землях, якая, як цьвердзіць „Сьветач Беларусі“, апанавана расейскай эміграцыяй і служыць інтэрэсам расейскім, ігнаруючы духовыя патрэбы праваслаўных беларусаў.

„На Пераломе“. Пад такім загалоўкам у гэтым тыдні ў Вільні выйшла пабеларуску друкаваная аднаднёўка. Але ўлады яе сканфіскавалі.

„Іскры Скарыны“. Пад такім загалоўкам выйшаў у Празе чэскай № 1 журналу за м. ліпень 1931 г. Зьмест гэтага журналу: разважаньні Т. Грыба і Фр. Грышкевіча. Сэнс іх аднак не аднолькавы, бо на колькі разважаньні першага маюць характар об‘ектыўны, дык разважаньні другога сусём суб‘ектыўныя.

Яшчэ адна беларуская культурная сіла. Праўны аддзел Віленскага Унівэрсытэту скончыў з канцом м. м. гр. Аўгень Бартуль, Беларус. Віншуем і чакаем пры працы на нацыянальнай беларускай ніве.

Беларускі Нацыянальны Камітэт заграніцай. У Празе чэскай існуе „Беларускі Нацыянальны Камітэт за граніцай“, каля якога гуртуецца беларуская эміграцыя ў Чэхаславаччыне. Гэты Камітэт, як даведываемся, дня 2 траўня с. г. падаў мэморыял у Лігу Народаў аб палажэньні беларускага народу пад Польшчай.

З студэнскага жыцьця. Урад Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні месьціцца на вул. Вострабрамскай 9—2. Падчас усяго лета дыжуры сяброў Ураду адбываюцца адзін раз у тыдзень — аўторак, ад гадз. 16 да 18. Усякую карэспандэнцыю трэба кіраваць на наступны сталы адрэс: **Związek Akademików Białorusinów, Wilno, skrytka pocztowa Nr. 113.**

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

„Прад рэальнай пагрозай“. У сёлетнім годзе, як піша „Зьвязда“ (№ 176 з дня 2.VII 31), загатоўка хлеба натрапіць у Б.С.С.Р. на новыя перашкоды, бо сколектывізавана больш траціны ўсіх сялянскіх гаспадарак на Беларусі і ад іх у вялікай меры залежыць выкананьне хлебазагатоўкі. А колектывы якое і маюць збожжа, дык ня змогуць яго даставіць у гарады, бо нават ня маюць у што ссыпаць — ня маюць ані мяшкоў, ані адпаведных вазоў да перавозкі, а так-жа і збажжавых складаў. Дзеля гэтага камуністычныя хлебазагатоўшчыкі заклікаюць улады ня спускаць з увагі гаспадарак сялянскіх у хлебазагатоўцы, бо колектыўны хлеб няпэўны.

Слабое разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва. „Савецкая Беларусь“ (№ 149 з дня 2.VII.31) наракаючы на слабы размах сацыялістычнага будаўніцтва ў Б.С.С.Р. кладзе вялікія надзеі на падняцьце духа ў насельніцтва адпаведнай пралетарскай літэратурай, якую ўжо год часу гатовяць беларускія пралетарскія пісьменьнікі. Паводле камуністычнага рэцэпту гэтая літэратура будзе магутнай зброяй пралетарыяту ў разьвіцьці сацыялістычнага будаўніцтва і „цудоўна“ накіруе дух насельніцтва да камунізму.

Барацьба камуністаў з антысэмітамі. Камуністычныя газэты падаюць, што ў фабрыках на Беларусі ў апошнія часы пашырыўся антысэмітызм. Беларускія работнікі дамагаюцца высяленьня жыдоў з фабрык, матывуючы, што жыды нічога ня ўмеюць рабіць, бо прывыклі быць толькі кіраўнікамі работ. За гэткія адносіны да жыдоў камуністычныя ўлады „віноўнікаў“ аддаюць пад суд, як праступнікаў антысэмітызму.

З Польшчы.

Аўтабусы сталі ў цэлай Польшчы ад 1 г. м. У выніку перагавораў з уладамі аб паменшаньні падаткоў, рух аўтобусавы 5 г. м. быў тымчасова узноўлены. Перагаворы йдуць далей.

Работнікі бастуюць у значнейшых фабрычных цэнтрах, як Катовіцы, Плоцк, Беласток і інш. Мясцамі даходзіць да крывавых сутычак з паліцыяй.

З краю.

Высяленьне з Латвіі Кс. Бародзіча. Газэты падаюць, што латвійскія ўлады высялілі з граніц Латвіі ведамага „апостала“ польскасьці кс. Бародзіча, які прысвоіў сабе высокі духоўны тытул каноніка. Мусіць добра пазналіся і Латышы на „апостальстве“ Бародзіча, калі „папрасілі“ пакінуць яго гасьцінныя куты Латвіі.

Наваградзкім ваяводай мае быць палкоўнік Костэк-Бэрнацкі, ведамы з леташняй справы „Берасьця“.

Бура з пярунамі прайшла над Віленшчынай 7 і 8 г. м. і прычыніла шмат шкодаў.

— Dosyć wam durycca, — skazaŭ Andrej Hanusewič. — Na heta, bačyš, brat ty moj, i nawuki nia treba. Ot lepš budzie za ŭsio, raskažy, bratok, jak ty jechaŭ moram — akijanam, — źwiarnuŭsia jon da Amerykanca.

Usie zacikawilisia, a Adam staŭ raskazywać, jak pierabraŭsia praz hranicu; jak sałdat hnaŭsia konna, jak jon pryloh u ralli, što toj čuć-čuć nie najechaŭ; ale tyki sałdat nia prymieciŭ, bo hranicu pierachodzili ŭ nočy.

Najbolš cikawali ab tym wialikim mory, što na im niama darohi, a kolki dzion nia widać bierahu, tolki wada i wada. I wada nie takaja, ale horkaja, hustaja, jak u łužy i sałonaja, a jaje ani pić, ani ŭ joj što waryć možna.

— Fali, — kazaŭ jon, — chodziać, jak hory. Wot idzie hetkaja fala, jak naš kaścioł, užo, zdajecca, zalje, dyk nie; wot tak parachod u jaje ŭlezie i pierajdzie.

— A moj ty synočak, i tabie ničoha? — Karusia až dryžyć.

— Ciž ja tam adzin byŭ? Tam narodu tysiačy.

Niaŭžo tysiačy? — pytajucca ŭ jaho.

— A parachodu nie zalje? — pytajecca druhaja dziaŭčyna.

— U našym parachodzie jechała try tysiačy narodu. I wialiki-ž toj parachod! Wot kab wam rastłumačyć, tut skažu: parachod budzie wialičyniej, jak Haradzišča, a fali tak, jak tyja ŭzhorki kala Haradzišča. Ja niadaŭna, stojačy na Haradziščy, tak i ŭspomniŭ, jak stajaŭ na parachodzie: fali, jak hory taŭpiacca, wałkujucca, a zaškodzić jamu nia mohuć.

Usie zadumalisia i sam Amerykaniec zamoŭk, uspomniŭšy, jak učora pa nabaženstwie stajaŭ na Haradziščy z Anielkaj, jak raskazywaŭ oj ab Ameryce i taksama ab mory i parachodzie.

— Pachwalony Jezus Chrystus! štož wy tut siadzicio? peŭnie i nia wiedaicie, što ŭ Alšany chtości nowy pryjechaŭ. Nu, zhadajcie? E, kudy wam zhadać! — załapatała, ubiehšy, Malwina Urkielanka.

— Dy ty nie placi tut, a kažy tołkam, — skazaŭ Andrej Hanusewič.

— Skažu, skažu, bo wy sami nie dahadajeciesia. Pryjechaŭ da nas nowy ksiondz, małady wikary.

— Ot, peŭnie wydumała, — kaža Hanusewič.

— Jakoje, wydumała? Ja sama tam była, pry klabanii. Kab ja tak žyła, što pryjechaŭ,— małady, charoŭy: kryšku bolšy ad praboršča. A nawioz usiaho — ŭsialakaha, niejkija skrynki, wialiki koš, nu i doŭhuju skrynačku z ručkaj.

— A ci małady? — pytajucca dziaŭčaty.

— Ja-ž kazała: małady, charošy. Jak złaziŭ z wozu, dyk kašlaŭ.

— Moža chwory?

— Nia wiedaju, moža i chwory, bo ŭwajšoŭšy ŭ sieni, iznoŭ kašlaŭ. Aha! ja pytałasia ŭ zakrystyjana, što ŭ toj skrynačcy, dyk jon kazaŭ, što to music skrypka.

— Heta ty pryłhała, — kaža Hanusewič.

— Kab ja tak žyła, što pytałasia. A kali jon łhaŭ, dyk i ja łhu. Kali wyjšaŭ iznoŭ da wozu, jak zdymali koš z wiekam, jak našyja kufry, tolki zrobleny z biełych dubcoŭ, dyk jak wyjšaŭ užo biaz šapki, aha! dyk ja padychodžu, chacieła prywitacca, kažu: niech bendzie pachwalony... a ksiondz kaža pa prostu, wot tak, jak my haworym, kaža: „čaho chočaš?“

— Peŭnie paznaŭ, što durnaja, dyk skazaŭ hetak, — adazwaŭsia Michał Jakubiel z piečy.

— Jakoje, paznaŭ? Jonža mianie nikoli nia bačyŭ; ale tak skazaŭ, Boh jaho wiedaje, čamu? Aha! nu dyk ja kažu — i sama nia wiedała, što skazać — dyk pytajusia, ci zaŭtra ksiondz budzie spawiadać, dyk ksiondz iznoŭ pa prostu kaža: „pahladzim, moža i budu.“ Ale bywajcie zdarowyja, ja pajdu da chaty.

I pabiehła.

— Jana jašče dziesiać chataŭ ablacić; otža ciamnata ŭ nas! Biez nawuki narod prapadaje,— kazaŭ Andrej Hanusewič.

Jaho ŭžo nichto nia słuchaŭ, bo stali raschodzicca, a dziaŭčaty zhawarywalisia, kab zaŭtra iści da maładoha ksiandza da spowiedzi.

(d. b.)

081536

З заграніцы.

Новы курс унутранай палітыкі ў С.С.Р.Р. Ужо некалькі разоў бальшавікі мянялі курс унутранай палітыкі і пасьля кожнай такой перамены ствараласся ўсё новая апазыцыя проціў „прававарнага“ камуністычнага кірунку. Такім чынам натварыліся групы: „правага ўхілу“, „левага навароту“ „нэпаўцы“ „нацдэмаўцы“ і „прававерныя“ камуністы.

„Прававерными“ камуністымі лічыліся да гэтай пары за часоў дыктатуры Сталіна ўсе тыя, якія пакорна слухалі сталінаўскіх загадаў і стараліся праводзіць іх у жыцьцё. Усе іншыя, а пераважна прыхільнікі Троцкага, безміласэрна высяляліся ў найдалейшыя і найбольш глухія куткі С.С.Р.Р.

У апошнія часы аднак сам Сталін закрывіў і сваю лінію. Дня 6 г. м. ён у прамове на конфэрэнцыі савецкіх гаспадарчых арганізацыяў заявіў, што **трэба спаліць дасюлешнія камуністычныя сьвятасьці і вярнуюць шмат з таго, што дасюль было праступкам.** Сталін заявіў, што трэба вярнуцца да капіталістычнага спосабу выплаты работнікам за працу. У промысьле трэба заводзіць спосабы акорднай працы. Ня можна прасьледаваць вучоных царскай школы. Трэба скасаваць пяцідзённы савецкі тыдзень і вярнуцца да тыдня шасьцідзённай працы з агульным для ўсіх днём сьвята. Трэба пакасаваць фабрычныя камітэты і перадаць кіраўніцтва фабрык вызначаным дырэктарам. Сталін у сваей промове ані слова не зказаў аб раздутай на ўвесь сьвет „пяцігодцы“, а крытыкуючы сучасную гаспадарчую палітыку ў С.С.Р.Р. назваў яе хаосам. Далей Сталін заявіў, што трэба аграніччыць пануючую клясу (камуністаў—рэд.) на карысьць фаховай інтэлігенцыі і беспартыйных работнікаў, а так-жа трэба скасаваць камуністычную мэтоду працы і камуністычную плату за яе. Словам, у С. С. Р. Р. паступіў нейкі новы курс унутранай палітыкі. Ці гэта толькі слоўная „перадышка“, ці сапраўдны паварот да старых і больш практычных формаў гаспадаркі, пакажа будучыня.

Міжнародныя ваенныя даўгі і адсрочка іх сплаты. Нямеччына прайграўшы вайну была прымушана мірнымі дагаворамі сплачываць пераможцам усе ваенныя адшкадаваньні. Гэтыя цяжары за пройгрыш вайны ляглі цяжкім ярмом на Нямеччыну, так што яна не магла праз увесь паваенны час наладзіць сваей гаспадаркі і апошнім часам апынулася на краю гаспадарчай катастрофы.

Паводле ведамага пляну Юнга Нямеччына мусіла-б заплаціць у часе ад 1 ліпня 1931 г. да 30 чэрвеня 1932 году разам 1.697 мільёнаў ням. марак золатам. З гэтага прыпадае кругла ў мільёнах: Францыі —838, Англіі — 362, Італіі — 190, Японіі — 13, Португаліі — 13, Румыніі — 12, Грэцыі 3 з палавінай, Польшчы — палавіна мільёна, а Зл. Шт. Амэрыкі — 66 мільёнаў.

У гэтым самым часе Францыя мусіла-б заплаціць Амэрыцы 228 і Англіі 255, — разам 483 мільёны, пакідаючы сабе „чыстага даходу“ за выйграную вайну 359 мільёнаў. Іншыя дзяржавы расквітаваўшыся з сваімі даўжнікамі мелі-б некаторыя сусім малазначучыя сумы за выняткам Італіі — 77 мільёнаў і Англія — каля 40 мільёнаў ням. марак. За тое Зл. Шт. Амэрыкі атрымалі-б ад эўрапэйскіх дзяржаў — адзін мільярд і дваццаць мільёнаў ням. марак.

Але аказалася, што галоўнае жарало гэтых ваенных адшкадаваньняў — гаспадарка Намеччыны ня ёсьць выстарчальнай, каб заплаціць такую суму сваім пасрэднім і беспасрэднім даўжнікам, якія перамаглі яе ў сусьветнай вайне. Прэзыдэнт Нямеччыны Гіндэнбург аб невыстарчальным стане нямецкай гаспадаркі заявіў галоўнаму даўжніку — Зл. Штатам Амэрыкі — прэзыдэнту Гувэру. Пасьля такой заявы асталіся даўжнікам да выбару толькі дзьве магчымасьці: акупаваць нямецкія тэрыторыі і выціскаць з Нямеччыны ваенныя адшкадаваньні, або адсрочыць гэтую сплату надалей. Зл. Штаты Амэрыкі выбралі магчымасьць другую.

Менш зацікаўленыя дзяржааы на прапазыцыю Гувэра згадзіліся адразу. Адна толькі Францыя доўга ўпіралася, але ўрэшце таксама мусіла здацца.

Такім чынам разрахунак сусьветнай вайны адсунены далей і калі пераможцы ня пойдуць на ўступкі пераможанай Нямеччыне, аканчальны разрахунак можа стацца новай завярухай у Эўропе.

Да нас пішуць:

НАШ ВОЙТ.

Вішнева, Вялейскага пав. Ужо 5 гадоў мінула, як адбыліся ў нас выбары войта, а выбіралі яго толькі на тры гады. Можа хто падумае, што надта добры войт удаўся, калі так доўга не зьмяняюць. Ня ведаю каму ён такі добры і хто яго так доўга трымае, але сяляне дык хочуць новых выбараў войта, бо ён на гэтай службе можа і сусім забыцца гаварыць пабеларуску. Пакуль наш войт быў звычайным простым чалавекам, г. зн. ня быў войтам, калі рабіў у нас печы і падмуровачкі пад хаты, быў чалавекам добрага характару, гаваркі, прыемны, адным словам чалавек. А цяпер ён сусім ня той, перамяніўся. Хто загаворыць да яго пабеларуску — ведама, папольску нашы людзі ня ўмеюць, — ён з таго сьмяецца, або і нічога не адкажа. Сьведамую беларускую моладзь дык навучыўся называць бальшавікамі.

Вось дзеля гэтых прычын нашы сяляне і хочуць каб адбыліся новыя выбары войта.

Вішнеўскі.

ПАРА ПРАБУДЗІЦЦА.

Гэрманавічы, Дзісьненскага пав. Баліць душа, робіцца сумна, калі вазьму ў рукі сваю родную газэту „Беларускую Крыніцу“ і прачытаўшы, не знайду ні слоўца напісанага з Дзісенскага пав., асабліва з Гэрманаўскай гм., гдзе я працаваў для свайго народу. Бывала ня раз пісаў я карэспандэнцыі ў родную газэту, выясьняючы на ўвесь сьвет крыўды і радасьці нашай ваколіцы.

А цяпер ня чуваць, паснулі. Браты! Стыд і ганьба спаць, калі народ беларускі ўсюды будзіцца ад вечнага сну. Трэба як мага хутчэй ісьці наперад, трэба пашыраць свае родныя газэты, кніжкі, закладаць гурткі Б. І. Г. і К. Ведаю добра з практыкі, што на гэтым шляху спатыкаюцца ўсялякія перашкоды. Розныя панкі і асаднікі панасыланыя з Польшчы нагаварываюць нашу моладзь у „Kółka młodzieży“, у „Strzelcy“, а беларускіх працаўнікоў страшаць Лукішкамі. Але на гэта не зважаць, трэба йсьці наперад. Я веру, што іскра нацыянальнага адраджэньня не пагасьне, аб чым пацьвярджае і наш народны гымн:

„Не пагаснуць зоркі ў небе,
Покі неба будзе,
Не загіне край забраны,
Покі будуць людзі...“

Але нам трэба працаваць. Дык заклікаю Вас Браты да працы, да працы культурна-асьветнай на роднай беларускай ніве.

П. Жучок.

З Вільні.

Ліквідацыя коопэратывы „Хатні Промысл“ у Вільні. 17 ліпня а гадзіне 15 адбудзецца другі ліквідацыйны сход сяброў коопэратывы „Хатні Промысл“ з наступным парадкам: 1) справаздача ўраду коопэратывы аб дзейнасьці за 1928, 1929, 1930 і 1931 год; 2) пастанова аб ліквідацыі, 3) выбары ліквідацыйнае камісіі.

Калі ў азначаным часе не зьбярэцца патрэбны лік сяброй, то а гадзіне 16 у тым самым месцы адбудзецца з гэтым самым парадкам дня надзвычайны сход, важны пры ўсякім ліку сяброў.

За Урад: М. Гузоўскі.

Дэмонстрацыі безработных. Віленскія безработныя бурна дэмонстравалі ў аўторак 7 г. м. і ў сераду 8 г. м. У выніку гэтага арыштавана і перадана судовым уладам 28 асоб.

Прысланае

Ад Наглядной Рады і Управы Беларускага Коопэратыўнага Банку ў Вільні.

У апошнія часы з пэўных кругоў грамадзянства пашыраюцца злосныя чуткі, быццам Банк знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане, ліквідуецца, банкрутуе... З гэтай прычыны Наглядная Рада і Ўправа Банку даводзяць да ведама сяброў Банку і наагул беларускага грамадзянства, што гэтыя чуткі ня маюць ніякай асновы, а зьяўляюцца толькі палітычным манэўрам успомненых кругоў, якія страцілі свае уплывы ў Банку і іншых беларускіх грамадзкіх установах. Бязумоўна, у сучасны мамэнт нябывалага эканамічнага крызісу, безрабоцьця і агульнага зьбядненьня, Банк, як і ўсе іншыя крэдытовыя, гандлёвыя і прамысловыя ўстановы, часам адчувае недахоп бягучай гатоўкі. Бываюць, зразумела, і неакуратныя сябры, але гэта блізу выключна сябры б. Глыбоцкага Аддзелу Банку, дзе варожыя дзейнікі з ненавісьці да ўсяго беларускага, павялі з восені 1929 году злосную агітацыю, быццам Банку ўжо няма, зачыніўся, зьліквідаваны... Нягледзячы на цяжкі эканамічны мамэнт і варожую агітацыю, Банк што раз больш перамагае труднасьці і перашкоды, што стаяць на яго шляху, аб чым найлепш сьведчыць ніжэй зьмешчаны балянс Банку за І-шае паўгодзьдзе с. г.

Наглядная Рада і Ўправа Банку гэтым заклікае грамадзянства ня верыць у злосныя выдумкі і просіць усіх сьвядомых і чэсных грамадзян асьведамляць у гэтым менш сьведамых сяброў. Трэба памятаць, што Банк на ўсю Заходнюю Беларусь (пад Польшчай) зьяўляецца адзінай беларускай эканамічнай і крэдытовай установай, дык дзеля гэтага, адкідаючы ўсялякія палітычныя парахункі, хай кожны лепш падумае над тым, каб самому хутчэй палажыць сваю цэглінку пад будову эканамічнага дабрабыту нашага народу.

БАЛЯНС

Беларускага Коопэратыўнага Банку ў Вільні у дню 30 чэрвеня 1931 году.

Актыў		Пасыў	
Р-к Касы	182.41	Р-к Паявога Капіталу	26826.10
„ Касы Аддзелаў	597.56	„ Запаснага Капіталу	11.46
„ Пазык	74504.16	„ Рэзэрвовага Капіталу	1285.39
„ Пратэставаных Вэксалёў	14872.48	„ Фонду Будовы Дому	5.00
„ Зваротных Выдаткаў	630.06	„ Тэрміновых Укладаў	31290.30
„ Бюджэтаых Выдаткаў	4351.92	„ Бягучых Рахункаў	29416.82
„ Рухомай Маемасьці	2456.30	„ Дробных Ашчадн. Укладаў	412.18
„ Працэнтных папераў	119.00	„ Працэнтаў і Камісіі	4830.77
„ Дэбэтараў-Крэдытораў-суб. дэп.	335.00	„ Пераходных Сум	606.37
„ Працэнтаў выданых ад укладаў	0.04	„ Працэнтаў прычыт. ад ўкладаў	3011.10
„ Арганізацыйных Выдаткаў	246.74	„ Дэбэтараў Крэдытораў (па б. Глыбоцкаму аддз.)	588.27
		„ Розьніцы Курсу	11.91
БАЛЯНС	98295.67	БАЛЯНС	98295.67

8 ліпня 1931 г.
Вільня, Каралеўская 3—8.

**Наглядная Рада
і Управа Банку**

Рэдактар Янка Пазьняк.
Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня.
Выдавец А. Шутовіч